Узгадайце вывучаныя ў папярэдніх класах вершы і апавяданні, прысвечаныя маці.

***Зо́лкі*** — *тут*: неспрыяльны.
***Парушы́нка*** — маленькая часцінка чаго-небудзь, пылінка.

## КАЛЫХАНКА МАМЕ

*Ніна Мацяш*

Быць разам выпадае нам так мала...
Забудзь трывогу вечную сваю,
Прыляж, мая натомленая мама,
Як некалі ты мне, табе спяю.
Задрэмлюць веі над вачыма карымі —
Не дам упасці й парушынцы я.
Сустрэнься ў сне з сабой, мая ласкавая,
З вясной сваёю, любая мая.

Хоць кропля з абяцанага нам маем
Збываецца праз золкія гады.
Прыляж, мая даверлівая мама,
Спяю табе, як мне спявала ты.
Задрэмлюць веі над вачыма карымі —
Не дам упасці й парушынцы я.
Сустрэнься ў сне з сабой, мая ласкавая,
З вясной сваёю, любая мая.


Правообладатель Национальный институт образования

Любоў нябёсы над табой трымае,
Любоўю зорацць дні ў тваім акне.
Прыляж, мая ўсмешлівая мама,
Спяю табе, як ты спявала мне.
Задрэмлюць веі над вачыма карымі —
Не дам упасці й парушынцы я.
Сустрэнься ў сне з сабой, мая ласкавая,
З вясной сваёю, любая мая.

1. Якімі вы ўявілі матулю і дачку — гераінь гэтага твора?
2. Якія словы ўжывае паэтэса для характарыстыкі мамы? Як праз іх раскрываюцца асобы дачкі і матулі?
3. Патлумачце сэнс выразу «Любоўю зорацць дні ў тваім акне».
4. Для чаго, на вашу думку, паўтараецца адно і тое ж чатырохрадкоўе? Як вы разумееце яго сэнс?
5. Чаму Ніна Мацяш назвала свой верш калыханкай?

Верш Ніны Мацяш пакладзены на музыку кампазітарам Інай Вінаградавай. Паслухайце песню «Калыханка маме». Якія ўражанні і думкі яна выклікала ў вас?

### ПРЫКАЗКІ

- Родную маці нікім не заменіш.
- Птушка рада вясне, а дзіця — маці.
- Няма лепшай хаткі, як у роднай маткі.
- Матуліны рукі заўсёды мяккія.
- Шануй бацьку з маткаю: другіх не знойдзеш.


Правообладатель Национальный институт образования

За што вы ўдзячны сваёй першай настаўніцы? Хто з вас хацеў бы ў будучым стаць педагогам? Чаму?

## ПЕРШАЯ НАСТАЎНІЦА

*Васіль Жуковіч*

Мне першая настаўніца
запомніцца навек.
Найпершая настаўніца —
мой родны чалавек.

Такая клапатлівая,
ласкавая яна,
як веснавое сонейка,
як цёплая вясна.

Запомняцца, запомняцца
ўрокі дабраты.
У нашае настаўніцы
характар залаты.

Усходамі парадуе
пасеянае ёй.
Найпершая настаўніца —
святло душы маёй.

1. Якім у памяці паэта застаўся вобраз першай настаўніцы? Чаму ён назваў яе родным чалавекам?
2. Якія словы ўжывае аўтар, характарызуючы сваю настаўніцу?


Правообладатель Национальный институт образования

3. Як вы разумееце сэнс выразу «характар залаты»? Пра якіх людзей звычайна так гавораць?
4. Аб якіх усходах гаворыцца ў вершы?
5. Што вы можаце сказаць пра асобу самога паэта, прачытаўшы гэты верш?
6. Вывучыце верш на памяць.



1. Разгледзьце скульптурную кампазіцыю «Настаўніца першая мая» беларускіх мастакоў Дзмітрыя Бубноўскага і Аляксандра Шомава.



2. Адкажыце на пытанні.

1) Каму прысвечана гэта кампазіцыя? Як вы здагадаліся?

2) Апішыце знешні выгляд настаўніцы: прычоску, твар, адзенне, фігуру. Чаму яна трымае менавіта кнігу?

3) З якой мэтай, на вашу думку, скульптары стварылі гэты помнік? Што яны хацелі сказаць людзям?


Правообладатель Национальный институт образования